# “Творчы вечар” на Першым нацыянальным канале Беларускага радыё

24-04-2024

Дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны Алена Паўлава прыняла ўдзел у літаратурнай праграме Г.Шаблінскай  “Творчы вечар” на Першым нацыянальным канале Беларускага радыё.

Тэмай праграмы стала 80-годдзе Дзяржаўнага літаратурнага музея Я.Купалы і круглы стол “МУЗЕЮ ЯНКІ КУПАЛЫ – 80”, які адбыўся ў музейнай установе з гэтай нагоды. Разам з Аленай Паўлавай гасцямі студыі сталі вучоны сакратар купалаўскага музея Галіна Варонава і загадчыца аддзела навукова-экспазіцыйнай і выставачнай работы музея Марыля Барткова, а таксама першы намеснік дырэктара па навуковай рабоце Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Аляксандр Бараноўскі.

Алена Паўлава расказала аб даследаваных ёй дакументах архіўнага фонду БДАМЛМ “Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы”, якія адлюстроўваюць багаты вопыт навукова-даследчай і культурна-адукацыйнай дзейнасці музея па збіранні,  вывучэнні і прэзентацыі спадчыны Янкі Купалы і іншых дзеячаў культуры Беларусі.

Алена Якаўлеўна адзначыла, што як працяг шматгадовай традыцыі супрацоўніцтва музея з установамі адукацыі, ужо 7 гадоў на базе ўстановы “Дзяржаўны літаратурны  музей Янкі Купалы” дзейнічае філіял кафедры гісторыка-культурнай спадчыны. Асноўнымі напрамкамі супрацоўніцтва з'яўляюцца правядзенне ў музеі практычных і семінарскіх заняткаў, майстар-класаў, праходжанне студэнтамі ўсіх відаў практыкі, валанцёрства студэнтаў кафедры падчас правядзення сацыяльна-культурных праектаў музея.

